УДК 947.6

***С.Я. НОВІКАЎ***

# БОЙ НА БУЙНІЦКІМ ПОЛІ: ПОГЛЯД У СВЯТЛЕ НЯМЕЦКІХ ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ КРЫНІЦ

*Упершыню ўводзіцца нямецкая архіўная крыніца аб баявых падзеях пад Магілёвам 12 ліпеня 1941 г. Паказана навуковая значнасць дакумента. Аналізуецца стан сучаснай айчыннай гістарыяграфіі і крыніцазнаўства на прадмет паўнаты выкарыстання дакументальных крыніц для ўсебаковага даследавання баявых падзей на Буйніцкім полі. Апісваецца ход баявых дзеянняў на паўднёва-заходняй лініі дняпроўскага рубяжа. У дэталях паказаны ход баявых дзеянняў трох нямецкіх рот, якія спрабавалі прарваць савецкую абарону ўздоўж шашы Быхаў-Магілёў, паміж Бабруйскай шашой і чыгункай на Гомель, паміж чыгункамі на Гомель і Асіповічы. Прыведзены вынікі баявых дзеянняў. Паводле нямецкага дакумента, на сваім шляху танкавы батальён германскага вермахта сустрэў моцны рубеж супраціўлення, на якім мужна стаялі савецкія воіны, выконваючы загад вышэйшага камандавання аб пераўтварэнні Магілёва ў "непрыступную крэпасць".*

Айчыннаму чытачу ўпершыню прадстаўлена магчымасць пазнаёміцца з дакументам, які ўтрымлівае шэраг важных звестак аб тым, што з нямецкага боку адбывалася ў ходзе баёў пад Магілёвам 12 ліпеня 1941 г., вядомых у айчыннай гістарыяграфіі як "бой на Буйніцкім полі" [1, с. 315]. Між тым больш чым праз шэсць з паловай дзесяцігоддзяў цікава ведаць, як поўна тыя падзеі адлюстраваны ў навуковых даследаваннях і наколькі гэта адпавядае айчынным і замежным дакументальным і гістарыяграфічным крыніцам? У такім аспекце прапанаваны дакумент носіць адметны характар.

Не меншы інтарэс маюць фактычныя даныя аб баявых дзеяннях пад Магілёвам на працягу "гарачага" суботняга дня. У дзённіку баявых дзеянняў 6-га нямецкага танкавага палка, 2-гі батальён якога якраз і вёў бой на паўднёва-заходніх падыходах да горада на Дняпры, захаваліся рапарты трох танкавых рот (5-й, 7-й і 8-й). Яны з'яўляліся непасрэднымі выканаўцамі загаду камандзіра 3-й танкавай дывізіі, якая ў складзе 2-й танкавай арміі (танкавай групы. – С.Н.) павінна была забяспечыць "прарыў скрозь умацаванні на Дняпры і пачаць наступленне на Смаленск" [2, Bl. 204]. Раніцай 12 ліпеня 1941 г. ад камандзіра дывізіі генерал-лейтэнанта В. Модэля паступае кароткае паведамленне: "Становішча на 6.00: 3-я танкавая дывізія наступае на ворага (так у дакуменце. – С.Н.) на захадзе ад Дняпра, на паўднёвы захад ад Магілёва" [3, Bl. 3].

У той жа час у ранішнім запісе 2-й танкавай арміі адзначалася, што палявы штаб камандуючага генерал-палкоўніка Г. Гудэрыяна знаходзіўся ў Талачыне,

стаяла сухое надвор'е. З вячэрняга запісу штабнога аддзела вынікала: "Дзённае паведамленне, 12.7.41, 23.40. 3-й танкавай дывізіі вылучыцца з раёна Буйнічы для правядзення пераправы цераз Днепр злева ад 10-й пяхотнай дывізіі (паміж Магілёвам і Старым Быхавам. – С.Н.), каб весці наступленне ў раёне Магілёва – Чавусаў – Роснаў" [3, Bl. 59].

Дадатковыя факты ўтрымліваюць таксама і іншыя дзённікавыя запісы. Так, камандаванне палка, выконваючы загад камандзіра дывізіі, розным шляхам здабывала звесткі аб ландшафце мясцовасці, размяшчэнні на ёй абарончых умацаванняў, наяўнасці жывой сілы і баявых пазіцыях савецкай абароны. А 20-й гадзіне 11 ліпеня разведка дакладвала, што на захадзе, поўначы і поўдні горада знаходзяцца процітанкавыя равы і мінныя палі, умацаваныя пазіцыі процітанкавай артылерыі [4, Bl. 12]. Даныя, атрыманыя камандаваннем палка, былі тэрмінова перададзены камандзірам трох рот, якія раніцай 12 ліпеня пачыналі наступленне з папярэдне вызначанымі арыенцірамі для атакі, адпаведна: 1) в. Буйнічы; 2) цагельня; 3) в. Туманаўка. Гэта азначала, што ўвядзенне ў бой трох рот 2-га батальёна на напрамку яго галоўнага ўдару прадугледжвала першапачатковае вырашэнне лакальных задач: для 7-й роты – наступленне паўздоўж шашы Быхаў-Магілёў; для 8-й роты – паміж Бабруйскай шашой і чыгункай на Гомель; для 5-й роты – паміж чыгункамі на Гомель і Асіповічы. Атрымлівалася, наяўныя перашкоды на заходнім беразе Дняпра штучна размяжоўвалі роты паміж сабой.

Галоўны прадмет навуковага інтарэсу ляжыць, на наш погляд, у рапартах камандзіраў танкавых рот [5, Bl. 40-45] і спісе аб іх колькасным складзе [5, Bl. 49-50]. Баявыя дзеянні, праведзеныя ў ходзе выканання пастаўленых задач і зафіксаваныя ў рапартах, складалі лакальныя сюжэты суцэльнага малюнку падзей 12 ліпеня. Звесткі аб разгортванні баявых дзеянняў на асобных участках паўднёва-заходняга плацдарма пад Магілёвам (4 км. – С.Н.) паказваюць ступень баявой гатоўнасці абаронцаў горада, у першую чаргу вайсковых часцей Чырвонай Арміі, якія ў баявых умовах паказвалі свае тактычныя ўменні, дэманстравалі практычныя навыкі і выкарыстоўвалі здабыты палявы вопыт падчас арганізацыі абароны трывалага рубяжа на Дняпры. Паводле новай дакументальнай крыніцы, на лініі наступлення, непасрэдна ў раёне в. Буйнічы, праціўнік сустрэў эфектыўна дзеючую агнявую абарону савецкіх артылерыстаў, танкістаў і пяхоты, а таксама мінныя палі, якія не засталіся па-за ўвагай нямецкага камандавання. Як вынікае з нямецкага дакумента, бой на ўчастку мясцовасці пад в. Буйнічы, дзе вяла наступленне 7-я танкавая рота, меў свае значныя адметнасці [5, Bl. 40-42].

З дакумента таксама бачна, што ў ходзе баёў, якія адначасова ішлі на трох напрамках наступлення нямецкіх танкавых рот, самым складаным для іх з'яўляўся ўчастак баявых дзеянняў не пад палявой в. Буйнічы, а ў раёне лясной в. Туманаўкі. Калі 8-я танкавая рота, якая дзейнічала ў цэнтры наступаючай групы, здолела ў асноўным выканаць задачу на ўчастку паміж Бабруйскай шашой і чыгуначнай лініяй на Гомель, пры гэтым узяць у палон 80 чырвонаармейцаў [5, Bl. 44], то на лініі наступлення, якое з левага флангу спрабавала весці 5-я танкавая рота, пад Туманаўкай савецкія артылерысты, баявыя разлікі танкаў і процітанкавых гармат трапным агнём, а сапёры ў выніку ўмела расстаўленых мін вывелі са строю, падарвалі і знішчылі *ў с е* баявыя машыны 2-га і 4-га ўзводаў танкавай роты [5, Bl. 43].

Навуковы аналіз дакумента садзейнічае атрыманню новых, хаця і супярэчлівых звестак аб рэальных баявых падзеях, да гэтага часу ўсебакова не адлюст-

раваных нават у спецыяльных даследаваннях [6]. Паводле гісторыка-дакументальнай хронікі Магілёва [7], гарадоў і раёнаў Магілёўскай вобласці [8] і новых прац аб абароне на Дняпры [9], "гарачы" ліпеньскі дзень 1941 г. дагэтуль застаецца ў рамках канцэпцыі, заяўленай першым летапісцам гісторыі гераічнай абароны дняпроўскага рубяжа на Буйніцкім полі – ваенным карэспандэнтам К.М. Сіманавым.

У нашым выпадку дакумент у дапаўненне да традыцыйнага апісання бою на Буйніцкім полі дае магчымасць ўбачыць другую частку суцэльнага малюнку падзей "гарачага дня", "зыходзячы з канкрэтнай абстаноўкі таго часу, з рэальна існуючай сітуацыі" [6, с. 3], даведацца аб фактычных сілах баявога супрацьстаяння, удакладніць сапраўдныя маштабы баявых дзеянняў, і самае істотнае, у колькасным аспекце убачыць баявыя падзеі на паўднёвым участку абароны Магілёва. Інакш кажучы, знайсці адказы на шэраг пытанняў, але перш за ўсё, як піша апантаны магілёўскі пошукавец М.С. Барысенка, сказаць суровую праўду аб трагічным леце 1941 г. на дняпроўскім рубяжы [6, с. 5].

Дакумент дапамагае чытачу ўбачыць падзеі з абодвух бакоў, у тым ліку і процілеглага боку, без якога не было б рэальных баявых дзеянняў пад Магілёвам, у тым ліку гераічнай абароны гэтага плацдарма сіламі 388-га стралковага палка і магілёўскімі апалчэнцамі. Можна не прымаць некаторых высноў і ацэнак, змешчаных у баявых рапартах, аднак нельга адмаўляць факты, якія патрабуюць узважанага аналізу, крытычнага падыходу і грунтоўнай апрацоўкі спецыялістамі. Аўтар у дадзеным артыкуле не ставіць перад сабой такой задачы, а толькі ўводзіць у шырокі ўжытак архіўны дакумент. Паглядзець на падзеі з іншага боку, вачыма праціўніка, крайне карысна для высвятлення ісціны ў навуцы, для аб'ектыўнага аналізу падзей ваеннай гісторыі Беларусі. А гэта ставіць чытача перад няпростым выбарам: або адысці ад аднабаковага погляду і, такім чынам, пазбегнуць суб'ектыўных ацэнак, або пайсці па шляху набліжэння да рэальнай карціны – усебаковага аналізу падзей на аснове існуючых гістарычных і гістарыяграфічных крыніц. Зазначым, што нямецкі дакумент не замоўчвае тое, што чырвонай ніткай праходзіць праз рапарты аб баявых дзеяннях пад Магілёвам 12 ліпеня 1941 г.: на сваім шляху армейскія вайсковыя часці германскага вермахта сустрэлі моцны рубеж супраціўлення, на якім мужна стаялі савецкія воіны, выконваючы загад вышэйшага камандавання аб пераўтварэнні Магілёва ў "непрыступную крэпасць" [8, с. 190].

Тэкст падрыхтаваны да друку на аснове дакумента, выяўленага аўтарам у фондзе Федэральнага ваеннага архіва Германіі ў Фрайбургу (зямля Бадэн-Вюртэмберг. – С.Н.). Цалкам дакумент складаецца з 5 розных матэрыялаў, частка з якіх не мае дачыненняў да даследуемай тэматыкі, таму апушчана ў тэксце. Чытач заўважыць гэта па адпаведным адкроп'і, прынятым у літаратуры. Прапанаваны дакумент уключае рапарты трох рот. Пераклад зместу рапартаў і спісу зроблены з нязначнымі купюрамі. У дачыненні да асобных палажэнняў і спецыфічнай лексікі рапартаў аўтар палічыў патрэбным унесці пэўныя ўдакладненні, узятыя ў англійскія дужкі, якія не скажаюць сэнс, а робяць для чытача тэкст больш даступным. Рымскія абазначэнні, праз якія ў дакуменце зафіксаваны нумары германскіх вайсковых фарміраванняў, перадаюцца арабскімі лічбамі.

*Федэральны ваенны архіў Германіі, далей BA-MA. RH 27-3/29: Panzer-Regiment 6. Erfahrungsbericht: Kampf der II./Pr.Rg.6 bei Mogilew am 12.7.1941, Bl. 40–51, тут 40–46. Арыгінал (пераклад аўтара). Друкуецца ўпершыню.*

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

6-ы танкавы полк [10, s. 221] Палявы штаб, Гарбатка, 20.7.41
I a
<...>[1]
[Камандаванню]
3-й танкавай дывізіі[2]
<...>[3]

I. Бой 2-га батальёна[4] 6-га танкавага палка пад Магілёвам.

1. <u>Рапарт 7-й роты[5] аб баявых дзеяннях пад Магілёвам 12 ліпеня 1941 г.:</u>

Спачатку рота з удзелам мотапяхоты і пры падтрымцы артылерыі шырокім клінам прасунулася ў паўночна-ўсходнім напрамку. Чыгунка[6] была дасягнута і пераадолена ў пункце 12 без сутыкнення з ворагам. Рота прайшла лес і спынілася на свабодным месцы на поўдзень ад [ракі] Ераўкі.

З улікам таго, што левая наступаючая група для прасоўвання наперад павінна была выкарыстоўваць шашу[7], 1-ы ўзвод быў накіраваны на пошук праходу праз нізінны ўчастак, паколькі пяхота не выканала просьбу аб разведцы. У ходзе цяжкага пераходу броду адзін танк застаўся ў рацэ з пашкоджаннямі вядучага кола. На вышыні на ўсход ад Ераўкі рота замацавалася ў суправаджэнні роты тэхнічнага забеспячэння і праз 4-ы ўзвод ўстанавіла сувязь з пяхотай, якая падыходзіла да Сяльца.

Рота з пяхотай пачала прасоўвацца далей перабежкамі на паўднёвы край [в.] Буйнічы.

Да гэтага часу рота не мела сутыкненняў з ворагам. Многія пазіцыі ў лесе і вакол вёскі былі не занятымі. Паводле звестак ваеннапалонных, тры рускія (чытай савецкія. – С.Н.) батальёны адступілі ўначы на ўчастку роты. Пры замацаванні 1-га ўзвода на пазіцыях на усход ад Ераўкі была адбіта атака рускай пяхоты.

Пры набліжэнні да [в.] Буйнічы былі бачны адыходзячыя рускія, якія за пагрозы сваёй пяхоце не маглі весці бой. На занятай мясцовасці засталіся разбураныя акопы і хады злучэння. У час бою, які пачаўся пры ўзаемадзеянні з 2-м узводам 3-га пяхотнага палка, на правым флангу з'явілася процітанкавая гармата, ліквідаваная адразу ж 1-м узводам. З пачаткам моцнага абстрэлу процітанкавых

---

[1] Указаны службовыя спасылкі, у адпаведнасці з якімі падрыхтаваны дакумент.

[2] У пачатку вайны ў склад 3-й танкавай дывізіі ўваходзілі тры палкі, з якіх: два танкавых (6-ы і 3-ці грэнадзёрскі) і 394-ы пяхотны.

[3] Прыведзены рапарты I і II батальёнаў аб баявых дзеяннях пад Студзёнкай-Валковічамі і Чавусамі, а таксама рапарт аб тэхнічным становішчы і вопыце арганізацыі бягучага рамонту.

[4] Паводле даведніка Г. Тэсіна, у якім змешчаны звесткі аб штатным раскладзе часцей вермахта, летам 1941 г. 6-ы танкавы полк складаўся з I і II танкавых батальёнаў, у склад якіх першапачаткова ўваходзілі па 3 роты: дзве з іх былі ўкамплектаваныя лёгкімі танкамі T II і сярэднімі танкамі T III і T IV. Фактычна агульная колькасць танкаў у двух батальёнах у ходзе летніх баёў 1941 г. складала 208 адзінак, уключаючы танк камандзіра палка. За першыя чатыры тыдні баёў, тры з якіх прыходзіліся на тэрыторыю Беларусі, было страчана 54 танкі, большая частка з якіх – пад Магілёвам. Летам 1942 г. колькасць рот у батальёне вырасла да чатырох, аднак пры гэтым у дывізіях, якія былі задзейнічаны ў групе армій "Цэнтр", засталося толькі па адным батальёне.

[5] Летам 1941 г. на ўзбраенні нямецкай танкавай роты знаходзіліся тры віды танкаў: лёгкі T II (экіпаж – 3 чалавекі, на ўзбраенні стаяла 20 мм гармата, 7,92 мм кулямёт), сярэднія – T III (экіпаж – 5 чалавек, 37 мм гармата, два 7,92 мм кулямёты) і T IV (экіпаж – 5 чалавек, 75 мм гармата, два 7,92 мм кулямёты). Як бачна са спісу (гл. дакумент), "лёгкая" рота мела на ўзбраенні 5 танкаў T II і 17 танкаў T III, усяго 22 танкі; "сярэдняя" (без аднаго ўзвода) – 5 танкаў T II і 10 танкаў T IV.

[6] Маецца на ўвазе чыгунка Магілёў – Гомель.

[7] Маецца на ўвазе Бабруйская шаша.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

гармат 3-ці ўзвод цалкам спешваецца, на заходнім канцы [в.] Буйнічы знішчае дзве процітанкавыя гарматы, пакінуўшых пазіцыю, хаця дзве другія працягваюць весці агонь, змяняючы свае пазіцыі. Абстрэл процітанкавых гармат пры гэтым не спыняецца. Таму для ўзмацнення абароны левага флангу побач з 3-м узводам уводзіцца 4-ы ўзвод. Гэта падраздзяленне здолела знішчыць злева ад дарогі дзве процітанкавыя гарматы і танк Т 26[8]. У гэты момант на правым флангу адзін за адным з'явіліся 4 танкі Т 26 і Т 37[9], знішчаныя 1-м узводам.

На працягу ўсяго бою рота была пад агнём не толькі процітанкавых гармат і танкаў ворага, але і прыцэльнага агню артылерыі, добра бачнай на вышыні і з узлеску на поўнач і паўночны ўсход ад [в.] Буйнічы.

Рота тэхнічнага забеспячэння, якая да гэтага не была задзейнічана, знаходзілася пад прыкрыццем танкаў і асобных збудаванняў, з гэтага моманту з некалькімі танкамі выкарыстоўваецца для прачэсвання тэрыторыі злева ад шашы. З умацаваных пазіцый і бліндажоў пры дапамозе ручных гранат былі захоплены каля сотні [савецкіх] палонных.

Толькі што ўведзены 2-гі ўзвод 3-га пяхотнага палка атрымлівае загад наступаць разам з танкамі. У гэты ж час у роту паступае загад батальённага [камандавання] засяродзіцца ў раёне галоўнай шашы з захаду ад чыгуначнага пераходу. Да канчатковага высвятлення пытання, які загад падлягае выкананню, рота атакуе ў напрамку чыгункі з адлегласці ў 1200 м, дзе на паўночны захад ад [в.] Буйнічы з'явілася пяхота, якая з цягачамі, артылерыяй і танкамі займала падрыхтаваныя пазіцыі ў раёне размешчаных процітанкавых равоў.

Пасля таго, як пяхота заняла абарону, рота была гатова выконваць загад аб ліквідацыі ворага. У гэты момант танк Т III трапляе на міны, у выніку чаго былі паранены вадзіцель і радыст. Паколькі пашкоджанні атрымаў корпус, каробка перадач і хадавая частка, можна было лічыць танк цалкам страчаным. Другі танк Т III быў ужо выведзены са строю ў выніку пападання [савецкага] танка і спаўзання ў абарончую траншэю. Абодва камандзіры, якія рабілі намаганні эвакуіраваць свае танкі, атрымліваюць раненні ад снайперскіх стрэлаў.

Пасля эвакуацыі наступаючых рота сабралася ў згаданым пункце.

<u>Заўвагі:</u> Міны, хутчэй за ўсё, выстаўляюцца так, каб 4 ці 5 мін ляжалі на мінным полі хаатычна і на рознай адлегласці паміж сабой. Таму ў час наступлення рота павінна перайсці гэтае поле і не патрапіць на міны.

2. <u>Рапарт 5-й роты аб баявых дзеяннях пад Магілёвам 12 ліпеня 1941 г.:</u>

1-ы і 4-ы ўзводы адзін ля другога і разам з мотапяхотай наступалі на Гуслянку. 3-ці ўзвод разам са ўзводам мотапяхоты быў выкарыстаны на левым флангу для разведкі мясцовасці ў раёне [вёсак] Чэлнаўка, Тачка, Туманаўка, у той час як 2-гі ўзвод заставаўся ў якасці рэзерву для падыходзячага камандзіра роты капітана Папэ злева ад шашы[10] і пазней злева ад чыгункі Стары Быхаў – Магілёў[11]. Асаблівую перашкоду складалі лес і балота, якія пралягалі праз мясцовасць для наступлення з захаду на ўсход.

На вышынях на паўночны ўсход ад Туманаўкі перадавыя часці роты сустрэлі моцны агонь артылерыі і танкаў. Пасля зацяжной перастрэлкі, якую вялі ўзводы, камандзір роты прасунуўся да пярэдняга рубяжа наступлення і спыніў роту каля

---

[8] Савецкі танк Т 26 выкарыстоўваўся ў пачатку вайны: лёгкі танк з экіпажам 3 чалавекі. На ўзбраенні стаялі 45 мм гармата і 7,62 мм кулямёт, лабавая браня – 16 мм.

[9] Лёгкі танк масай да 14,65 т, які абмежавана выкарыстоўваўся ў пачатку вайны.

[10] Маецца на ўвазе шаша Магілёў – Бабруйск, ці Бабруйская шаша.

[11] Маецца на ўвазе чыгунка Магілёў – Жлобін – Гомель.

вышыні. Потым вярнуўся назад для таго, каб падцягнуць наперад мотапяхоту. Між тым 1-ы ўзвод заўважыў артылерыйскія ўмацаванні і выступіў пад прыкрыццем чыгуначнага насыпу наперад для іх знішчэння. Каля 800 м на поўнач ад вышыні каля самай чыгункі 1-ы ўзвод трапіў на міны. У гэты час да вышыні вяртаецца камандзір роты разам з мотапяхотай. Але вышыню вымушаны былі пакінуць у сувязі з моцным артылерыйскім агнём. Танкі і пяхота замацавалася побач з вышынёй злева ад чыгункі пад яе прыкрыццем. Камандзір роты аддае загад 4-му ўзводу пайсці ў абход як мага далей на захад, каб з дапамогай тэхнічнага ўзвода знайсці праход праз разведаныя процітанкавыя равы, 2-і ўзвод быў пазней пасланы для падмацавання.

2-і і 4-ы ўзводы выступілі ў напрамку [в.] Галынец без уліку таго, што там можа знаходзіцца тэхнічны ўзвод. Між тым камандзір роты з 3-ім ўзводам прасунуўся на поўнач у напрамку разведаных савецкіх палявых умацаванняў, каб вывесці з акружэння 1-ы ўзвод, каб прарваць лінію акружэння і заняць суседнюю вышыню, якая знаходзілася амаль у 1000 м далей на поўнач па лініі наступлення. Два танкі 3-га ўзвода прарвалі драцяную загароду і ўварваліся на лінію агню. Пры гэтым выявілася, што замест процітанкавых равоў тут былі траншэі.

Пры авалоданні палявымі ўмацаваннямі два танкі 3-га ўзвода трапляюць пад моцны агонь, які з невялікай адлегласці злева і справа вёўся з васьмі бачных процітанкавых умацаванняў. Танкі загарэліся. Камандзір роты прыкрыў агнём свайго танка адступленне рэштак 3-га ўзвода цераз варожыя акопы і драцяную загароду. Атакуючыя дасягнулі танка камандзіра і скарысталі яго для свайго прыкрыцця. Падчас адыходу камандзірскі танк быў выведзены са строю трапным пападаннем ў башню, што пашкодзіла гармату, а самога камандзіра смяротна параніла.

2-і і 4-ы ўзводы сталі недасягальнымі па радыё, паколькі ўсе танкі абодвух ўзводаў былі выведзены са строю агнём артылерыі і процітанкавых гармат. Частка танкістаў вярнулася назад праз [вёску] Галынец пад прыкрыццем дымавой завесы. Рэшткі роты з'явіліся на чыгуначным пераездзе пад камандаваннем лейтэнанта Хінцпетера.

3. <u>Рапарт 8-й роты аб баявых дзеяннях пад Магілёвам 12 ліпеня 1941 г.:</u>

8-я рота спачатку заставалася ў рэзерве на танкавай дарозе[12] ў тыле ад камандавання 2-га батальёна. У ходзе наступлення батальён Вельмана, якому падпарадкоўвалася 7-я рота, патрабаваў танк, што прывяло да страты сувязі з 7-й ротай. Па загадзе 8-я рота наступала справа ад танкавай дарогі на Магілёў, каб аднавіць сувязь з батальёнам Вельмана. У [в.] Буйнічы рота наносіла ўдар па пярэдняй [савецкай] пяхотнай роце і выкарыстала процітанкавую гармату. Паколькі перад пяхотнай ротай знаходзілася 7-я рота, 8-я рота адышла назад, каб падтрымаць злева ад танкавай дарогі 5-ю роту. У час адыходу здавалася, што у батальёна Вельмана як быццам не існуе сувязі паміж сабой, а таксам адсутнічае сувязь паміж асобнымі ротамі. Пры прыбыцці ў Сялец – месца размяшчэння батальёна – рота атрымала загад весці наступленне злева ад танкавай дарогі і ўсталяваць кантакт з 5-й ротай. Рота наступала клінам паміж чыгункай і дарогай. Ужо праз некалькі соцень метраў пачаўся абстрэл праціўніка, пазіцыі якога спачатку не былі выяўлены. Рота працягнула наступленне. Мэтай наступлення была цагельня на захад ад Магілёва і вышыні з лесам на захад ад яе. Цагельня і вышыні былі ўзяты пры агнявой падтрымцы, паколькі варожы агонь быў спачатку

[12] Маецца на ўвазе Бабруйская шаша.

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

слабы. На жаль, лейтэнант Нінабер атрымаў пападанне ў камандзірскую башню, зараджальшчык быў паранены, і башню заклініла. Між тым па сувязі рота чула рашучыя просьбы аб дапамозе ад 5-й роты і атрымала загад ад камандавання 2-га батальёна аказаць ёй дапамогу. Рота адразу ж павярнула да чыгуначнага насыпу. Прама на насыпе камандзір роты лейтэнант Кёлер наехаў на міну, якая прабіла корпус, пашкодзіла гусеніцу і цяжка параніла обер-яфрэйтара Бюхлера. Выкліканы для эвакуацыі параненага танка танк Т II таксама наехаў на міну, што пашкодзіла гусеніцу. У той час як лейтэнант Кёлер выступіў далей, каб праз іншы танк паведаміць аб страце і даць даручэнне камандаваць ротай лейтэнанту Якабсу, увесь экіпаж танка 800 пры эвакуацыі атрымаў кулямётныя раненні. Рота ўтварыла выступ да цагельні, чыгуначнага насыпу і абароны горада. Перад горадам ляжаў пояс моцных палявых умацаванняў, якія знаходзіліся ў савецкіх руках. Рота атакавала іх і, дзякуючы свайму моцнаму агню, прымусіла адступіць. Асобныя танкі наступалі да самога процітанкавага рова з умацаваннямі, у якіх сядзелі рускія. Варожы агонь спыніўся. Калі рота заняла мясцовасць, былі знішчаны: два танкі і дзве процітанкавыя граматы.

5-я рота магла дапамагчы роце настолькі, наколькі гэты было магчыма для роты, якая залягла па прычыне сталага франтавога агню ворага. Дапамога для эвакуацыі параненых была немагчыма, паколькі з-за вышыні чыгуначнага насыпу адсутнічалі якія-небудзь умовы для яго пераезду.

Хутка пасля гэтага рота атрымала ад камандавання 2-га батальёна радыёзагад на адыход разам з параненымі. Тры машыны эвакуіравалі спачатку многіх параненых пяхоты. Потым рота адышла. Хаця вярталіся па вядомым следзе, на міну наехаў танк Т IV, на які быў перасаджаны лейтэнант Кёлер. Была пашкоджана хадавая частка. Другі танк вяртаўся па ўжо вядомым следзе і наехаў на міну так, што не мог больш рухацца. Пад варожым кулямётным і артылерыйскім агнём рота спрабавала звыш гадзіны адбуксіраваць абодва танкі, што, аднак, не ўдалося пад агнём варожай артылерыі.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: Энцыкл. / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1990. – 680 с.
2. BA-MA. – RH 21-2/927: KTB (Kriegstagebuch) № 1 der 2. Panzer-Armee (Panzergruppe 2): Darstellung der Ereignisse am 12. Juli 1941.
3. BA-MA. – RH 21-2/124: KTB (Kriegstagebuch) № 1 der 2. Panzer-Armee (Panzergruppe 2): Anlagen v. 12.7.1941.
4. BA-MA. – RH 27-3/165: Taetigkeitsbericht der 3. Panzer-Division v. 11.7.41.
5. BA-MA. – RH 27-3/29: Panzer-Regiment 6. Erfahrungsbericht: Kampf der II. / Pr.Rg.6 bei Mogilew am 12.7.1941.
6. ***Борисенко, Н.С.*** Днепровский рубеж: трагическое лето 1941-го / Н.С. Борисенко. – Могилев: УПКП “Могилевская областная укрупненная типография имени Спиридона Соболя”, 2005. – 368 с.
7. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва / Беларус. Энцыкл.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1998. – 496 с.
8. Памяць: Магілёўскі р-н: Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / Укл. У.Ф. Агурцоў, М.П. Хобатаў. – Мінск: Полымя, 1996. – 660 с.
9. Оборонительные бои на территории Беларуси: Респ. науч.-практ. конф., посвященная 65-й годовщине обороны Могилева, 29–30 июня 2006 г. / Под ред. Н.М. Пурышевой. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2006. – С. 8-16.
10. ***Tessin, G.*** Verbaende und Truppen der deutschen Wehrmacht und Waffen-SS im Zweiten Weltkrieg. Bd. 15: Die Waffengattungen- und Gesamtuebersicht / G. Tessin. – Osnabrueck, 1977.

Паступіў у рэдакцыю 01.03.2007 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова